

# Гродзенскі Універсітэт

ГАЗЕТА КАЛЕКТЫВУ ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ Я.КУПАЛЫ

Выдаецца з 1986 года ● *№ 4 (265)* ● *5 мая 1999 года, чацвер*

Выходзіць адзін раз на месяц ● Распаўсюджваецца бясплатна


# 9 МАЯ — ДЕНЬ ПОБЕДЫ

## *Са святам!*

**Усё далей у мінулае адыходзяць пераможныя залпы 9 мая 1945 года. Усё далей тыя дні, калі менш за ўсе гады нараджалася дзяцей, і калі больш за ўсё было ў людзей гора. І, на вялікі жаль, усё менш застаецца сярод нас ветэранаў і ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны і партызанскага руху. Але Ваш подзвіг, шаноўныя нашы ветэраны, жыве і будзе жыць. З пакалення ў пакаленне перадаецца павага да Вас і памяць аб тых, каго ўжо няма з намі.**

**У гэты светлы майскі дзень мы нагадваем Вашы подзвігі, успамінаем кожнага і ўсім сэрцам дзякуем Вам. Каб ніколі не паўтарыліся жудасці вайны, маладыя пакаленні павінны ведаць усю праўду і помніць. І толькі Вы, удзельнікі і відавочцы тых падзей, праўдзіва і шчыра можаце расказаць сваім нашчадкам аб вайне. Каб ведалі... Каб помнілі...**

**Дык нізкі ж паклон Вам, паважаныя ветэраны! Здароўя Вам, душэўнага спакою, павагі, радасці. Заставайцеся з намі!**

**РЭКТАРАТ, ПРАФКАМ, САВЕТ ВЕТЭРАНАЎ.**

## ПРИБЛИЖАЛИ КАК МОГЛИ...



**Е. ДАЛИДОВИЧ, заместитель декана по воспитательной работе юридического факультета, старший преподаватель**

9 мая 1999 года исполняется 54 года со дня разгрома гитлеровской армии в Великой Отечественной войне 1941-1945 гг.

Для перелома наступательного фронта гитлеровской армии вглубь Советского Союза большую роль сыграло развивающееся партизанское движение и всенародное сопротивление немецко-фашистским захватчикам.

Так, на оккупированной территории Беларуси уже к концу лета 1941 года началось подпольно-партизанское движение. Создавались партизанские группы, отряды, бригады, перераставшие в крупные соединения. В партизаны добровольно шла белорусская молодежь. По архивным данным, около 80 тысяч комсомольцев находилось в партизанских отрядах в тылу врага на территории республики.

Большие силы партизанского движения составляли кадровые военнослужащие Красной Армии и пограничных войск, которые выходили из вражеского окружения или бежали из плена. Местные жители были у них надежными проводниками.

Так шло зарождение и стремительное пополнение партизанского движения. По официальным архивным данным, перед освобождением Белоруссии от немецко-фашистских захватчиков в тылу врага на территории республики армия партизан составляла 744 тысячи человек.

На первом этапе партизанского движения ощущалась нехватка боевого оружия и боеприпасов. Уже позже партизанам Белоруссии поставлялись из-за линии фронта на самолетах стрелковое оружие, боеприпасы, комплектующие взрывных устройств и медикаменты. Однако и этого было явно недостаточно, чтобы всех, кто приходил в партизанские отряды, полностью вооружить. Бывший начальник белорусского штаба партизанского движения Пономаренко П.К. отмечал, что вместе с партизанами громили немецкие гарнизоны и люди без огнестрельного

*(Окончание на 3-й стр.).*

## ВІНШАВАЛЬНАЯ ПАШТОЎКА

**НАГАДВАЕМ, КАЛІ І КАГО МОЖНА ПАВІНШАВАЦЬ З ЮБІЛЕЕМ.**

❋ 5 мая - **Антаніну Іванаўну ЗАКУДОЎСКУЮ** - вартаўніка навучальнага корпуса N 3.

❋ 6 мая - **Людмілу Іванаўну БЫРДУ** - прыбіральшчыцу навучальнага корпуса N 1.

❋ 8 мая - **Марыю Якаўлеўну КУЗЬМІЧ** - прыбіральшчыцу навучальнага корпуса N 1.

❋ 18 мая - **Анатоля Анатольевіча КАРДАБНЁВА** - дацэнта кафедры педагогікі.

❋ 22 мая - **Галіну Іванаўну ЛЕБЯДЗЕВІЧ** - бібліятэкара.

❋ 23 мая - **Аляксандра Мікалаевіча МЯТЛІЦКАГА** - старшага выкладчыка кафедры АГ і методыкі выкладання матэматыкі.

❋ 28 мая - **Валянціна Іванавіча БУТРЫМА** - начальніка першага аддзела.

## ЦИТАТА НОМЕРА:

***«Время — великий учитель».***

***Э. Берн.***

## 5 МАЯ -
## ЗЕНЬ ДРУКУ

урналісты, паліграфісты,
штатныя карэспандэнты,
давецкія работнікі адзна-
ючць 5 мая сваё прафесійнае
та. Сёлета яно аздоблена
чэ і тым, што наш
версітэт рыхтуецца да
айго 60-годдзя, і ў нашым
рыядычным друку гэтая
а дамінуе. А наш перыя-
чны друк - гэта шматты-
жная газета «Гродзенскі
версітэт», якая выдаецца
986 года. навукова-тэарэ-
чны часопіс «Веснік Гро-
енскага дзяржаўнага
версітэта імя Янкі Купа-
», навукова-папулярны і
вукова-метадычны часопіс
льфа», які адрасаваны
дучым матэматыкам,
зікам, праграмістам.

Варта сказаць, што гэтыя
рыядычныя выданні выда-
цца ў сценах універсітэта.
шы аўтары забыліся на
рогу ў друкарні. Выдаецца
эбная, навуковая, навуко-
-папулярная і даведачная
аратура, у тым ліку і з
ыфам Міністэрства адука-
і РБ. Так, апошнім часам
ачылі свет пяць выданняў,
камендаваных Міністэр-
вам адукацыі ў якасці ву-
бных дапаможнікаў для
удэнтаў вышэйшых наву-
льных устаноў. Сярод іх -
Прыкладная электродинамі-
» загадчыка кафедры
дыёфізікі і электронікі пра-
есара Ю.М. Рычкова, «Юри-
ическая психология» да-
нта кафедры крымінальна-
права, працэсу і крымі-
лістыкі кандыдата юрыдыч-
х навук Г.Р. Шыханцова.

Выдаецца шмат іншай
етадычнай і вучэбнай
таратуры для навучальна-
працэсу, ідзе паўсядзён-
ая напружаная работа па
ляпшэнні знешніх якас-
ых характарыстык выдан-
яў. Адначасова засвойва-
цца новыя тэхналогіі.

Сёння ўжо кожны разу-
ее, што без сваіх перыя-
ычных, навуковых і вучэб-
ых выданняў і сваёй
аліграфічнай базы ў сучас-
ых умовах такі гмах, як
авуковая і навучальная ўста-
ова, не змог бы існаваць
аўнацэнна.

## ГРОДЗЕНСКАМУ ДЗЯРЖАЎНАМУ УНІВЕРСІТЭТУ ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

*ПОСТАЦІ ВНУ*

# ПРЫ ЎСПАМІНАХ АБ ІМ СВЯТЛЕЮЦЬ...

**Віктар ТАРАНЦЕЙ, прафесар**

Ён нарадзіўся ў вёсцы Мячэск Бярэзінскага раёна Мінскай вобласці. У 1938 годзе скончыў гістарычны факультэт Мінскага педінстытута імя Максіма Горкага. У працоўнай біяграфіі Д.С. Маркоўскага адзначана работа дырэктарам сямігадовай школы ў роднай вёсцы (1930-1934гг.), начальнікам упраўлення сярэдніх школ Міністэрства асветы БССР (1938 г.), вучоба ў авіяшколе (1938-1939 гг.), работа ў якасці начальніка Дома Чырвонай Арміі (1939-1941 гг.).

Рэктар Д.С. Маркоўскі - удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Вайну закончыў падпалкоўнікам з узнагародамі - ордэнамі «Чырвонай зоркі», «Айчыннай вайны II-й ступені». Пазней да баявых узнагарод дабавіліся ордэны «Знак пашаны» і «Працоўнага Чырвонага Сцяга», чатыры Ганаровыя граматы Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР.

Кандыдат гістарычных навук з 24.04.1956 г. Узначальваў калектыў Брэсцкага педвучылішча (1945-1953 гг.), настаўніцкага інстытута ў г. Маладзечна (1953-1954 гг.). У 1955-1973 гг. працаваў рэктарам Гродзенскага педагагічнага інстытута.

### АСОБА Д.С. МАРКОЎСКАГА ВА ЎСПАМІНАХ І ДАКУМЕНТАХ

«Накіраваць дырэктара Маладзечанскага настаўніцкага інстытута Д.С. Маркоўскага з 1.09.54 г. па 1.09.55 г. у Кіеўскі дзяржаўны універсітэт імя Т.Р. Шаўчэнкі для падрыхтоўкі кандыдацкай дысертацыі».

**Намеснік Міністра асветы БССР С.УМРЭЙКА, загад ад 30.08.54 г.**

«Прызначыць з 1.12.1955 г. дырэктарам Гродзенскага педагагічнага інстытута Маркоўскага Дзмітрыя Спірыдонавіча з правам подпісу першай рукі на ўсіх дакументах. Акрэсліць тэрмін у сем дзён для перадачы спраў, дзеля чаго камандзіраваць у Гродна прадстаўніка Міністэрства асветы С.Я.Іванскага».

**З загада Міністэрства асветы БССР.**

«Высокакваліфікаваны работнік вышэйшай школы, здольны арганізаваць і кіраваць калектывам... За перыяд з 1956 г. па 1969 г. з інстытута выпушчана каля 5600 настаўнікаў».

**З характарыстыкі Д.С. Маркоўскага (1969 г.)**

«Для мяне Д.С. Маркоўскі, па-першае, уяўляецца вельмі добрым чалавекам, які, будучы на высокай пасадзе рэктара, мог вырашыць пытанні не толькі як рэктар, але і з пазіцыі добрага разумення чалавечых характараў, гуманістычна. Па-другое, Д.С. Маркоўскі валодаў вялікім запасам плюралістычных магчымасцяў у разуменні другога чалавека, што для таго часу было нават нерэальным назіраць у іншых кіраўнікоў. Патрэцяе, гэта быў чалавек, поўнасцю аддадзены рабоце і калектыву. Знаходжанне ў любы час на працы было сэнсам жыцця рэктара».

**І.Д. РАЗЕНФЕЛЬД, дырэктар Інстытута сацыяльна-гуманітарных праблем пры Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы, прафесар, доктар філасофскіх навук.**

«Сціплы, просты, даступны, карэктны і ветлівы быў рэктар Д.С. Маркоўскі. Заўсёды трымаў сваё слова. Стараўся дапамагчы ўсім, не падзяляючы членаў калектыву на рангі. Умеў выдатна зносіцца са студэнтамі. На нашым гісторыка-філалагічным факультэце студэнты саромеліся карыстацца на экзамене ў рэктара шпаргалкамі, хаця Д.С. Маркоўскі мог бы на гэта і не звярнуць увагі. Разам з галоўным бухгалтарам Ц.М. Гафмеклер з вялікімі цяжкасцямі асвойваў будаўніцтва новага корпуса. Пры ўспамінах аб Д.С. Маркоўскім мой твар святлее».

**Р.Ю.РАМАНЧУК, выпускніца гісторыка-філалагічнага факультэта, былы загадчык навучальнай часткі.**

«Вырашаць пытанні з Д.С. Маркоўскім мне, дэкану і старшыні прафкама супрацоўнікаў, было прыемна і лёгка. Ён не азіраўся на міністэрства, стараўся абараніць ад нягод супрацоўнікаў і студэнтаў. Д.С. Маркоўскі - гэта чалавек просты і ясны. Гэтага чалавека любілі нават за некаторыя чалавечыя слабасці».

**А.І. РАГОЙША, старшы выкладчык, былы дэкан факультэта педагогікі і методыкі пачатковага навучання.**

# У ЗША - ДОБРА, А ДОМА - ЛЕПШ



**Аляксандр Козел - асоба, даволі вядомая на сваім факультэце. І не толькі таму, што ён выдатнік. Пасля першага курса Аляксандр вучыўся па абмену студэнтамі ў ЗША. І гэты час успамінае часта. Як яму выпала такое? Саша ведае англійскую мову, а гэта - галоўнае патрабаванне. Здаў экзамен, прайшоў у Мінску сумоўе і... прайшоў.**

**- А ўсё-такі ў нас патрабаванні да студэнтаў больш высокія, - гаворыць ён. - І веды атрымліваем больш разнастайныя...**

**НАЗДЫМКУ: студэнт 4 курса факультэта эканомікі і кіравання Аляксандр КОЗЕЛ.**

# СТУДЭНЦКАЯ ВЯСНА-99

Стала традыцыяй кожную вясну праводзіць конкурс студэнцкай мастацкай самадзейнасці пад назвай «Студэнцкая вясна». Звычайна ў конкурсе ўдзельнічаюць усе факультэты. Рыхтуецца праграма, галоўная ўмова - каб яна не была падобнай на іншыя, каб была свежай, нечаканай. Ёсць і абавязковыя нумары - так званая візітка факультэта, дамашняе заданне. Тут і вызначаюцца элементы творчасці, выдумка, ініцыятыва.

Сёлета абласны фестываль «Студэнцкая вясна-99» набыў шырокі размах і стаў сапраўдным святам песні, гумару і весялосці. І вось ён падышоў да завяршэння. 23 красавіка ў актавай зале ГрДУ адбыўся заключны тур абласнога фестывалю, у праграме якога выступалі калектывы мастацкай самадзейнасці універсітэта, медыцынскага і сельскагаспадарчага інстытутаў.

Нашы выступілі найлепш. Асабліва вызначыліся аркестр народных інструментаў "Капрыз", СТЭМ "Вернісаж" і інш.

# ФАРМІРУЕЦЦА ПЕДАТРАД

Кожны год улетку для студэнтаў адкрываюцца магчымасці цікавай педагагічнай практыкі. Вось і сёлета фарміруецца універсітэцкі педагагічны атрад для работы з падлеткамі ў мікрараёнах Вішнявец і Дзевятоўка. Так што ў ліпені-жніўні студэнт можа не толькі блізка пазнаёміцца з будучай прафесіяй, але і папоўніць свой бюджэт: заработная плата складзе 4 мільёны рублёў у месяц.

# ПРИБЛИЖАЛИ КАК МОГЛИ...

*(Начало на 1-й стр.).*

оружия, но со штыками, ножами, вилами.

В зонах действия партизанских бригад создавались оружейные мастерские, кузницы и пункты боепитания, где ремонтировалось и приводилось в боевую готовность стрелковое и тяжелое оружие, изготавливались взрывные устройства для «рельсовой» войны с оккупантами. Одну из оружейных мастерских по поручению минского подпольного горкома партии весной 1942 года открыл в лесном массиве на стыке трех южных районов Минской области мой отец Далидович Н.И. Он был оружейным техником. Являясь связным штаба партизанского отряда им. Н. Щорса 3-ей Минской партизанской бригады им. С.М.Буденного, мне лично в юношеском возрасте вместе со своими родителями пришлось испытать трудности партизанской борьбы с немецкими оккупантами.

Великая Отечественная война длилась 1418 дней и ночей. Народы Советского Союза и Красная Армия без отдыха и передышки вели освободительные бои и тыловое обеспечение фронта. Только Победа, достигнутая хоть и дорогой ценой, решала судьбу страны и нашего народа. Открытие второго фронта наши союзники по войне умышленно затягивали. Его не было ни в 1941-м, ни 1942-м, ни в 1943-м, ни в первой половине 1944-го. Советской Армии все эти годы пришлось одной противостоять силам вермахта.

Особенно тяжелые бои вела Красная Армия при обороне Москвы, Ленинграда, Сталинграда и на Курской дуге. Основную часть воинского состава в тот период составляли совсем молодые юноши и девушки в возрасте от 17 до 24 лет, как теперь наши студенты. Молодые ребята рождения 1922 года почти все погибли, остались в живых не более 2%, а рождения 1923 года - только 1%. Такая же судьба постигла и белорусских ребят рождения 1927 года, призванных на фронт полевыми военкоматами летом 1944 года, в том числе и тех, кто был в партизанах.

Несмотря на такую мощную силу вторжения, советский народ и его Красная Армия, преодолевая неудачи и поражения на отдельных участках фронта, просчеты политического и военного руководства в подготовке к отражению агрессии, развеяли миф о непобедимости вермахта.

Победа советского народа и Красной Армии в Великой Отечественной войне имеет всемирно-историческое значение и является общечеловеческой и интернациональной ценностью. Интернациональной потому, что эта война была тесно связана с антифашистской, освободительной борьбой народов Европы.

Из оставшихся в живых ветеранов и участников войны в настоящее время плодотворно работают в Гродненском государственном университете имени Янки Купалы по обучению и воспитанию студентов И.И.Прокопьев, А.Н.Потапов, В.Ф.Ваньшин, И.М.Степуро, С.В.Кондратьева, Б.Ф.Гриценко, А.М.Шишко, А.И.Яроцкий, Г.Ф.Курышко, И.В.Гущин, А.А.Крушельницкий, В.И.Атрещенков.

Своим богатым жизненным опытом бывшие фронтовики, партизаны и подпольщики делятся со студенческой молодежью. В предпраздничные и праздничные дни их часто можно встретить в студенческих аудиториях и общежитиях на встречах с молодыми людьми, которые благодарны ветеранам за их жизненный подвиг.

Эти встречи оставляют глубокое впечатление у молодежи и играют важную роль в их патриотическом воспитании, правильном их понимании своего гражданского долга.

# ІМГНЕННІ САМАСТОЙНАСЦІ

Не памылімся, калі скажам, што пашчасціла нам (і выкладчыкам, і студэнтам беларускага аддзялення філалагічнага факультэта пятага курса) пабываць, хоць і нядоўга (усяго два месяцы), на невялікім, своеасаблівым астраўку роднай мовы і культуры, у шматпрофільным ліцэі № 1 пры ГрДУ імя Янкі Купалы. Астравок гэты - беларускі гуманітарны клас, дзе ўсе дысцыпліны вядуцца на матчынай мове. Што нельга сказаць пра іншыя класы, дзе яна засталася на правах госця ў сваёй роднай хаце. У размове з дырэкцыяй ліцэя выявілася, што і на будучае плануецца захаваць такое становішча пры ўмове, што змогуць зрабіць набор ліцэістаў у беларускія класы ў гэтым годзе. Хочацца верыць у шчырасць сказанага, у тое, што словы дырэктара ліцэя Андрэя Пятровіча Панцэвіча практычна ўвасобяцца ў жыццё, якое гэтага патрабуе. Пашчасціла, бо апынуліся нашыя выхаванцы амаль што ў роднай сям'і, сярод сваіх старэйшых калег, вопытных, даравітых настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры: Мікалая Іванавіча Белуша, Вольгі Львоўны Несцяровіч, Наталлі Васільеўны Булай, з якімі яны не стаміліся, а, наадварот, хоць на імгенение расправілі крылы для самастойнага палёту па жыцці, палёту творчага, мудрага, шчаслівага.

Пра іх першыя імгненні самастойнасці і першыя крокі гавораць яны самі і іх старэйшыя калегі...

Пятро МАЛЯЎКА,
групавы кіраўнік практыкай па беларускай мове
і літаратуры ў ліцэі № 1 г.Гродна,
кандыдат філалагічных навук,
дацэнт кафедры беларускай літаратуры
ГрДУ імя Янкі Купалы.

## МАНАЛОГ СТУДЭНТА

Таццяна МАЦЯС,
студэнтка 5 курса

Як мала часу засталося да заканчэння універсітэта! А далей - работа... І нават не ведаю, чаго больш хочацца - яшчэ трохі павучыцца ці ўжо самастойна працаваць. У адным я ўпэўнена: хочацца трошкі спыніць час, занадта хутка ён бяжыць. І куды ён бяжыць?

Ліцэй для мяне - свая сям'я. Грунтоўная падрыхтоўка, цікавыя заняткі, цудоўныя вучні і музыка на перапынках. Да гэтага так прывыкаеш, цябе так захапляе, што хочацца яшчэ лепш рыхтавацца, яшчэ адшукваць нешта новае і цікавае для вучняў, больш і больш заахвочваць іх.

Дзякуй Вам, 11 Б/Г (беларускі гуманітарны), за тое, што прынялі, зразумелі, дзякуй за сумесную працу. Наладзіць кантакт з людзьмі - цяжкая справа, асабліва калі перад табой - дзеці. І хаця семнаццацігадовых юнакоў і дзяўчат 11 Б/Г класа дзецьмі ніяк не назавеш, яны патрабуюць не меншай, а можа, яшчэ і большай увагі да сябе. Мы з імі амаль аднолькава пойдзем у далейшае самастойнае жыццё (розніца толькі ў тым, што для мяне гэта - самастойная праца, а для іх - самастойнае жыццё па-за межамі школы і апёкі бацькоў), таму хочацца, каб яны не згубілі сябе ў гэтым вялікім свеце.

Такіх вучняў, як мой 11 клас (а можа, ён і праўда мой?), заўсёды жадае кожны настаўнік, а таму я ўдзячна лёсу, што апынулася падчас педагагічнай практыкі менавіта ў ліцэі, менавіта ў 11 Б/Г. Канешне, сам ліцэй прадугледжвае больш высокі ўзровень навучання і выхавання вучняў, але ж і ад чалавека шмат залежыць. А гэта самае галоўнае - быць чалавекам, Чалавекам з Вялікай Літары. Менавіта такую настаўніцу, настаўніцу беларускай мовы і літаратуры я ўбачыла ў асобе Вольгі Львоўны Несцяровіч, педагога ад нараджэння, з якой хацелася б ісці і ісці па жыцці да здзяйснення сваёй запаветнай мары, стаць, як і яна, - Чалавекам з Вялікай Літары, быць яшчэ і Настаўнікам з Вялікай Літары.

## ЖАДАЮ ВЕРЫ Ў ДАБРЫНЮ

В. НЕСЦЯРОВІЧ,
настаўніца беларускай мовы і літаратуры ліцэя № 1

Знаёмства будучых педагогаў са школай адбылося. Праўда, на гэты раз для пяцікурснікаў універсітэта школа была не зусім звычайная: урокі праводзіліся ў ліцэі, у класах самых розных профіляў. Пра ўражанні студэнтаў ад сустрэчы з вучэбнай установай гаварыць не бяруся, а вось некаторымі сваімі думкамі падзяліцца хочацца.

Для мяне знаёмства з Таццянай Мацяс, якой «дастаўся» 11 беларускі гуманітарны клас, было прыемным. Ёсць людзі, якія нараджаюцца педагогамі. Яна, здаецца, з такіх. Усведамленне вялікай адказнасці, якая стаіць перад настаўнікам, уменне правільна арганізаваць урок, творчы падыход да атрыманых ведаў па метаду выкладання прадмета, багаты эмацыянальны свет - усё гэта ёсць у Таццяны Віталеўны.

А сёння ўрок беларускай літаратуры вымагае ад настаўніка многага. Тым больш, што працуем мы па новых праграмах, а падручнікаў для 11-ых класаў не маем. І пры гэтым трэба ж даць веды не толькі па манаграфічных і агладавых тэмах, але і па тэарэтычных паняццях, крытычных артыкулах.

Радуе змест літаратурных праграм. А задачы? Задачы заўсёды былі вялікімі. І ў нас, настаўнікаў, ёсць немалыя магчымасці для ўздзеяння на духоўны свет вучня, на фарміраванне яго асобы.

Сённяшняму грамадству, як ніколі, патрэбны людзі з чыстым сумленнем, акрэсленай грамадзянскай пазіцыяй, людзі, якія арыентуюцца на спрадвечную народную мараль, агульначалавечыя каштоўнасці.

Хочацца пажадаць і будучым педагогам, і тым, хто працуе сёння, і вучням новых цікавых сустрэч з творамі беларускіх аўтараў, а таксама веры ў шчаслівую будучыню нашай краіны, у дабрыню і справядлівасць.

## МАЕ ЎРАЖАННІ

Наталля ІВАНЮК,
студэнтка 5 курса

Мне выпала праходзіць практыку ў ліцэі № 1 г. Гродна.

Спачатку было цяжкавата наладзіць кантакт з вучнямі. Калі малодшыя школьнікі з радасцю ўспрымаюць маладога настаўніка-практыканта, то старэйшыя, а гэта - 9 клас, - ужо больш патрабавальныя да выкладчыка. Вучні на першых двух уроках насцярожана паводзілі сябе, паступова ацэньваючы мае паводзіны, культуру мовы і, наогул, агульны ўзровень падрыхтаванасці настаўніка. Аднак, пачынаючы з 3-га ўрока, з калектывам класа ў мяне наладзіўся кантакт, усталяваліся адносіны ўзаемаразумення: я імкнулася іх зацікавіць, а вучні дапамагалі мне ў арганізацыйных пытаннях.

Да некаторых вучняў неабходны быў індывідуальны падыход. Напрыклад, адзін вучань, імкнучыся звярнуць на сябе ўвагу, задаваў на ўроку пытанні не па тэме, чым перашкаджаў правядзенню заняткаў. Таму мне прыйшлося некалькі разоў задаваць сустрэчныя пытанні, якія ставілі яго ў тупіковую сітуацыю. Такім чынам, у яго прапала ахвота ставіць сябе на ўроку ў бязвыхадную сітуацыю.

Трэба адзначыць, што праграма універсітэцкай падрыхтоўкі нярэдка застаецца далёкай ад практыкі ў школе. Але пры ўзнікненні цяжкасцяў вялікую дапамогу я магла атрымаць ад майго настаўніка Н.В. Булай. Гэта сапраўдны майстра сваёй справы, высока-кваліфікаваны педагог, які тонка адчувае змены ў настроі класа.

Вялікі Вам дзякуй, Наталля Васільеўна!

# ЦІКАВЫЯ МОМАНТЫ,

## якія заўважаны на ўроках беларускай мовы

Жана ГАРЧЫНСКАЯ,
студэнтка 5 курса

Калі аднойчы трэба было правесці абагульняючы ўрок па бяззлучнікавых складаных сказах, то я вырашыла зрабіць яго ў якасці ўрока-гульні. Ён складаўся з 4-х этапаў:

- дыктант-віктарына (вучням зачытваліся пытанні, і яны ставілі толькі тыя знакі прыпынку, якія патрэбны);
- вусныя выказванні на такоў на пытанні;
- гульня на ўважлівасць (да дошкі выклікаюцца 3 вучні: першы вучань ставіць нумар сказа, у якім ставіцца «-», другі вучань - «:», трэці вучань - «,»);
- складанне тэкста на пэўную тэму, ужываючы апорныя словы. Напрыклад, тэма «На вакзале», апорныя словы - поезд, дзяжурны па станцыі, перон, праваднік, пасажыр.

Выйграе тая каманда, у якой атрымаецца лепш.

Называюцца ў канцы ўрока лепшыя знатакі, якія атрымліваюць адпаведныя адзнакі.

Вучням вельмі падабаюцца дэфармаваныя тэксты, якія ўключаюць вялікі набор слоў. Паводле гэтых слоў скласці трэба лагічна звязаныя паміж сабою складаныя сказы.

Цікавы для вучняў таксама такі момант, калі даецца заданне па групах, то я, каб было справядліва, прапаную цягнуць жэрабя, і, хто выцягвае, той і зачытвае заданне, выкананае ўсёй групай.

Вучням гэта вельмі падабаецца.

Таксама вялікую цікавасць і азарт выклікаюць у вучняў пытанні правакацыйнага кшталту: «Верыце ці не, што..?» і г.д.

Калі на ўроку беларускай мовы пісаліся афіцыйныя заявы, то большасць вучняў імкнулася надаць заяве гумарыстычную афарбоўку. Напрыклад, хтосьці пісаў, каб прынялі яго ў банк у якасці грошай, хтосьці хацеў быць дэгустатарам на лікёра-гарэлачным заводзе і г.д.

Гэта сведчыць аб тым, што, нягледзячы на цяжкія жыццёвыя ўмовы, дзеці яшчэ не забыліся, што такое гумар.

## ... на ўроках беларускай літаратуры

Расказваючы біяграфію П.Броўкі, я імкнулася засяродзіць увагу вучняў на яго дзяцінстве, вучобе. Імкнулася даць ім тое, аб чым яны ніколі не змогуць даведацца, бо падручнік настолькі суха дае матэрыял, што вучні, нават каб і хацелі, не здолеюць знайсці ў ім нічога цікавага, хоць пра біяграфію П.Броўкі шмат што вядома.

Мне давялося прачытаць кнігу «Успаміны пра П.Броўку», дзе паведамляюцца даволі цікавыя факты з яго біяграфіі. І на наступны ўрок, калі я спыталася ў вучняў, што яны запомнілі пра П.Броўку, яны амаль цалкам перадалі сутнасць таго, аб чым я ім паведаміла. Таму, каб засяродзіць увагу дзяцей, неабходна расказаць ім аб нечым цікавым, незвычайным, выключным.

На ўроку беларускай літаратуры, тэмай якой была Вялікая Айчынная вайна, я вырашыла прачытаць дзецям старонкі з дзённіка, які быў напісаны чалавекам (у гады вайны), якога немцы гвалтоўна вывезлі ў Германію, і якому давялося шмат праз што прайсці, каб захаваць сваё жыццё. Па прачытанні гэтага дзённіка вучні вельмі былі ўражаны жахлівымі старонкамі вайны. Яны чулі шмат пра вайну, але тут ім давялося сутыкнуцца з успамінамі сведкі вайны. Усё тое, што яны пачулі, было прынята імі на веру, і потым, калі працягваўся ўрок на ваенную тэму, то яшчэ шмат хто з вучняў падзеліцца тымі звесткамі, якія пачулі ад сваіх бабуляў і дзядуляў. Урок атрымаўся вельмі і вельмі цікавы, хоць і сумны (некаторыя вучні захацелі патрымаць гэты дзённік у сваіх руках і паглядзець, як і чым ён напісаны).

Разглядаючы паэму П.Броўкі «Голас сэрца», я вырашыла яшчэ да таго, як аналізаваць сам тэкст, прапанаваць дзецям карціну М. Савіцкага «Лічбы на сэрцы», каб глыбей зразумець сутнасць паэмы, а разам з тым і душэўны боль пісьменніка. Гэта аказалася вельмі ўражлівым.

# ВАЖНЫ КРОК

Алена МАСКЕВІЧ,
студэнтка 5 курса

Марозная зімовая раніца. Мы накіроўваемся ў ліцэй, дзе павінны праходзіць педагагічную практыку.

Я трапіла ў 11 Ф/Б (філалагічны беларускі) клас. Мяне пазнаёмілі з выкладчыкам беларускай мовы ў гэтым класе Мікалаем Іванавічам Белушам, які і стаў маім кіраўніком па практыцы ў школе. Адрэкамендавалі Мікалая Іванавіча як выдатнага педагога, метадыста. І я ўпэўнілася ў гэтым падчас сумеснай працы. Мікалай Іванавіч дапамог мне зрабіць яшчэ адзін крок наперад да маёй будучай настаўніцкай дзейнасці, растлумачыў і паказаў, як трэба выкарыстоўваць набытыя веды на практыцы, падчас працы ў школе. Я вельмі ўдзячна гэтаму выдатнаму педагогу.

## ЗДАРАЕЦЦА І ТАКОЕ

М. БЕЛУШ,
настаўнік беларускай мовы і літаратуры ліцэя № 1

Настаўніца звяртаецца да вучняў з мэтай даведацца, адкуль узяты наступны сказ: «Я чакаю цябе, бацька, - ціхім голасам працягвае Панас».

Вучань:

- З паэмы «Тарас на Парнасе».

Настаўніца:

- Неабходна прывесці прыклад на выкарыстанне выяўных сродкаў мовы (метафара, увасабленне, параўнанне).

Вучань:

- Сонца ўстала, трава лягла.

# ПРАКТЫКАНТ ТОЛІК

А. БРУСЕВІЧ,
студэнт 5 курса

Добра быць студэнтам апошняга пятага курса. Можна іншы раз і дазволіць сабе такую раскошу, як не пайсці на першую пару, каб даглядзець да канца ўсе відэакліпы падчас начнога падарожжа ў краіну сну. Але наўрад ці такую раскошу можна дазволіць, калі ў цябе педпрактыка і калі з самай раніцы трэба правесці тры ўрокі - у тым ліку і заліковы. Так атрымалася і з Толікам, студэнтам 5-га курса. Нягледзячы на бурнае святкаванне дня Святога Валянціна і на тое, што дахаты ён прывалокся, калі ўжо распачало сваю нялёгкую працу дэпо і вуліцы ўжо не начнога, але яшчэ і не ранішняга горада напоўніліся мэталёвым гучанкам тралейбусных ліній, ён усё ж такі здолеў неяк прачнуцца, пры тым да пачатку ўрока. Праўда, прачнуўся Толік выпадкова, па зусім банальнай прычыне - яму захацелася піць. Гадзіннік паказваў без дваццаці пяці восем. А ўрок пачынаўся ў 8.00. На жаль, варыянты былі страшна нерэальнымі. Напрыклад, адзін з іх быў такім, каб бегчы на стрым галавы. Але Толік не любіў ніколі фізкультуру, ды і не ў такім быў стане, каб прабегчы пару км за 20 хвілін. Праз некалькі хвілаў прыйшла лепшая думка, калі ён успомніў, што ад стыпендыі, здаецца, засталося трохі грошай, каб даехаць у ліцэй на таксі. Сказана - зроблена: хуценька апрануўшыся, спаласнуўшы твар і пачысціўшы зубы (хаця гэта не дапамагло), Толік ужо імчаўся на бліскучай Аўдзі-100 у напрамку месца праходжання практыкі. Яшчэ нават вучні не папрыходзілі ў клас. У класе яго ўжо чакала настаўніца, якая кіравала практыкай. На «добры дзень» яна адказала нейкай дзіўнай фразай: «А дзетачка, а ідзі ж ты дахаты». Сапраўды, выгляд быў у Толіка нейкі нездаровы і падазроны. Каб гэта быў іншы дзень, Толік так бы і зрабіў - пайшоў бы дахаты, але на зло ўсім законам подласці (выкінуў грошы на таксі, ды яшчэ пальчаткі ў машыне пакінуў), ён не згадзіўся нікуды ісці, застаўся праводзіць урокі. Наставіў троек. Раней Толік шкадаваў школьнікаў, а сёння быў злы на ўвесь свет і не шкадаваў нікога. Пасля ўрокаў Толік пайшоў на піва і вырашыў больш не адзначаць ніякія святы, аж пакуль не скончыцца практыка.

# НАВУКА - 98 НА ФІЛАЛАГІЧНЫМ

**М. ДАНІЛОВІЧ,**
**намеснік дэкана па навуковай рабоце філалагічнага факультэта**

За апошні год адметны для філалагічнага факультэта значнымі дасягненнямі ў сферы навукі. Многія выкладчыкі прыклалі шмат сіл для распрацоўкі навуковых тэмаў, напісання артыкулаў, навучальных дапаможнікаў, манаграфіяў. У выніку сярод усіх факультэтаў ГрДУ навуковыя поспехі філалагічнага факультэта атрымаліся найлепшымі. Пра гэта сведчаць статыстычныя паказчыкі. Так, на факультэце распрацоўвалася 21 навуковая тэма, з іх 6 - на фінансавай аснове. Праведзена 7 навуковых канферэнцыяў, з іх 4 - міжнародныя. У конкурсе па гуманітарных навуках, праведзеным у ГрДУ, сярод навукоўцаў першае месца заняў прафесар філалогіі П.У. Сцяцко, сярод кафедраў на другое месца выйшла кафедра рускай мовы.

Апублікавана звыш 280 навуковых працаў, з іх манаграфіяў - 1, зборнікаў навуковых працаў - 6, падручнікаў - 3, навучальных дапаможнікаў - 7, метадычных дапаможнікаў і матэрыялаў - 21. Варта пералічыць найбольш важныя кнігі:

- Русский язык. Культура устной и письменной речи: Учебник для 8 класса (Е.Е. Долбик, М.И. Конюшкевич, Ф.М.Литвиненко и др. - Мн.: Оракул, 1998.).
- Гребенщикова Н.С. Историко-лингвистический комментарий на уроках словесности: Пособие для учителей русского языка и литературы. - Мн.: Асар, 1998.
- Русский язык. Фонетика. Словообразование. Учебник для школ и классов с углубленным изучением русского языка (С.А. Горская, Л.В.Жуковская, А.В.Никитевич. - Мн.: Университетское, 1998.
- Мікуліч М.У. Пошук вядзе ў глыбіню. - Гродна, 1999.
- Жук І.В. Сустрэчны рух. - Гродна, 1999.
- Бурлыка І.Р. Сустрэчы з англамоўным светам: Навучальны дапаможнік. - Гродна, 1998.

Трэба назваць асобаў, якія ўнеслі значны ўклад у навуку і яе арганізацыю. Гэта: Т.Я.Аўтуховіч, В.М.Валашчук, Н.І.Власюк, С.А.Горская, Н.С.Грабеншчыкова, С.А.Емяльянава, І.В.Жук, В.С.Істомін, М.І.Канюшкевіч, Д.М.Лебядзевіч, І.Я.Лепешаў, М.О.Лойка, В.Л.Малышава, М.У.Мікуліч, С.П.Мусіенка, А.В.Нікіцевіч, Л.В.Рычкова, Л.М.Серада, П.У.Сцяцко, Т.І.Тамашэвіч, В.К.Царлюкевіч і інш.

Да таго ж творчая дзейнасць асобных вучоных заслугоўвае спецыяльнай гаворкі. Па справядлівасці перш за ўсё хочацца адзначыць дасягненні карыфеяў сучаснай беларускай лінгвістыкі П.У. Сцяцко і І.Я. Лепешава.

Дапаможнік прафесара кафедры беларускай мовы І.Я. Лепешава «У слоўнікавую скарбонку» (выдадзены ў пачатку 1999 г. ў ГрДУ) -незвычайная кніга. Незвычайная, таму што яна юбілейная - дваццатая на асабістым творчым рахунку вучонага. Аўтар з правам першаадкрывальніка апісвае новыя ці раней не зафіксаваныя пісьмовымі крыніцамі словы, фразеалагізмы, прыказкі, якія папоўнілі лексіка-фразеалагічны склад сучаснай літаратурнай мовы. Дарэчы, заўсёднай творчай рысай вучонага было імкненне да навізны, ён ніколі не браўся за тэмы, ужо кім-небудзь распачатыя. І папярэднія кнігі (заўважым, усе яны выдадзены ў дзяржаўных рэспубліканскіх выдавецтвах) - сведчанне гэтаму. Так, у 60-70-я гады пачынаецца лексікаграфічнае і тэарэтычнае апісанне літаратурнай фразеалогіі. Першымі ластаўкамі ў гэтай галіне сталі працы І.Я. Лепешава «Фразеалагічны слоўнік» (1973), «Фразеалогія ў творах К. Крапівы» (1976). Толькі з'явіўся ў прыватнай дыдактыцы такі кірунак, як лінгвістычны аналіз, - праз кароткі час выходзіць манаграфія І.Я. Лепешава «Лінгвістычны аналіз літаратурнага твора» (1981). Два выпускі «Этымалагічнага слоўніка фразеалагізмаў» (1981; 1993) - таксама новае для беларусістыкі. Яшчэ не ўсюды ў вну быў уведзены курс па культуры мовы, як выходзіць з друку дапаможнік «Асновы культуры мовы і стылістыкі» (1989). Доктарская манаграфія «Праблемы фразеалагічнай стылістыкі і фразеалагічнай нормы» (1984) - зноў жа распрацоўка цаліны ў стылістыцы. У выдавецтве «Беларуская энцыклапедыя» ўбачылі свет дзве працы І.Я. Лепешава: «Слоўнік беларускіх прыказак» (1996) і «Фразеалагічны слоўнік беларускай мовы» ў 2 т. (1993). Пра апошні газета «Літаратура і мастацтва» (8 ліпеня 1994) пісала, што гэта «значная падзея не толькі ў грамадска-культурным жыцці Беларусі, але і вялікі ўклад у славістыку наогул..., гэта апошняе слова сучаснай славянскай фразеаграфіі».

Мінулы год знамянальны яшчэ адной кнігай І.Я. Лепешава «Фразеалогія сучаснай беларускай мовы» (Мн.: Выш. школа, 1998), якая з'яўляецца вынікам шматгадовых тэарэтычных напрацовак вучонага. Як спецыяліст-фразеолаг, без перабольшвання скажу, што па глыбіні вырашэння шматлікіх, часта спрэчных пытанняў у сферы фразеалогіі, няма працы, роўнай гэтай на абшарах былога СССР.

Не меншай увагі заслугоўвае навуковая спадчына прафесара, загадчыка кафедры беларускага і тэарэтычнага мовазнаўства П.У. Сцяцко, нястомнага руплiўца роднага слова, вучонага акадэмічна рознабаковага і глыбокага. Кнігі, аўтарам ці суаўтарам якіх з'яўляецца П.У.Сцяцко, не толькі адлюстроўваюць моўныя з'явы ў навуковым аспекце, але ў многім вызначаюць ідэалогію і палітыку беларускай лінгвістычнай навукі. Вось некаторыя з іх: «Дыялектны слоўнік» (1970), «Народная лексіка» (1970), «Народная лексіка і словаўтварэнне» (1972), «Беларускае народнае словаўтварэнне» (1977), «Беларуская граматыка» (ч. І, 1985), «Беларуская мова» (1992), «Сінтаксіс сучаснай беларускай мовы» (1969; 1987), «Сучасная беларуская літаратурная мова: Марфалогія» (1975; 1980), «Лінгвістычная тэрміналогія ў курсах вну» (1984), «Руска-беларускі слоўнік лінгвістычнай тэрміналогіі» (1988), «Слоўнік лінгвістычных тэрмінаў» (1990).

У 1998 годзе навуковы багаж П.У.Сцяцко папоўніўся яшчэ дзвюма грунтоўнымі працамі: (у суаўтарстве) «Беларуская мова: Падручнік для навучэнцаў педвучылішчаў і каледжаў» (Мн.: Выш. школа, 1998); «Праблемы нормы, культуры мовы» (Гродна: ГрДУ, 199[illegible] [illegible]ая праца паспела атрымаць [illegible]кі рэзананс у грамадстве, бо яна закранае надзённыя праблемы нармавання беларускай літаратурнай мовы, ачышчэння ад усяго наноснага, што расхіствае яе як сістэму. У перыядычным друку апублікавана некалькі рэцэнзіяў, якія даюць аб'ектыўную ацэнку вартасці кнігі. Дазволю сабе прывесці асобныя вытрымкі з іх: «Праблемы нормы, культуры мовы» па змесце і праблематыцы - салідная манаграфія... Сёння без яе не змогуць абысціся навукоўцы, якім давядзецца пісаць падручнікі і дапаможнікі, складаць слоўнікі і нарматыўныя даведнікі па беларускай мове» (Роднае слова, 1998, N 10).

«Калі гаварыць пра змест кнігі «Праблемы нормы, культуры мовы» ў самых агульных рысах, то можна сказаць, што яе аўтар выклаў свой праект удасканалення мовы. Гэты праект заслугоўвае ўвагі і пры вывучэнні курса беларускай мовы студэнтамі-філолагамі, і пры напісанні граматык, фармуляванні правілаў арфаграфіі, і ў штодзённай працы ўсіх, хто мае справу з беларускай мовай -журналістаў, пісьменнікаў, выкладчыкаў» (Полымя, 1999, N 1).

«Кніга П. Сцяцко... - надта важкі ўклад у беларускае мовазнаўства... Разам з тым гэтая кніга - высокапатрыятычная праца, дзе адстойваецца нацыянальная адметнасць - дзеля захавання беларускай нацыі, яе найгалоўнейшай прыметы - нацыянальнай мовы» (Наша слова, 13 траўня 1998).

Навуковаму калектыву філалагічнага факультэта, такім чынам, ёсць кім і чым ганарыцца, а маладзейшым ёсць на каго раўняцца. Невыпадкова за апошні год пад кіраўніцтвам праф. П.У. Сцяцко абаронена 3 кандыдацкія дысертацыі, а па факультэце ў цэлым - 8 кандыдацкіх (С.А.Янушкевіч, А.Э.Астраух, Н.Э.Астраух, В.Б.Нікіфарава, А.У.Білюценка, І.І.Бубновіч, Ж.С.Сіпліўеня, А.У.Багдзевіч) і 1 доктарская (Т.Я.Аўтуховіч). З такім патэнцыялам, з такімі тэмпамі росту філалагічны факультэт чакае вялікая навуковая будучыня.

# СПОРТИВНЫЙ КАЛЕЙДОСКОП

Ру[...]ику ведет старший преподаватель кафедры физвоспитания Олег СМОЛЯКОВ

## КУБОК ПОЛУЧИЛ ПРОПИСКУ В УНИВЕРСИТЕТЕ

Двадцать команд вузов страны принимали участие в легкоатлетическом кроссе в программе Республиканских студенческих игр, который проводился в лесном массиве «Пышки». Общекомандную победу завоевала дружина Гродненского госуниверситета имени Янки Купалы. Кубок за победу получил гродненскую прописку. Второе место у команды Белорусской академии физвоспитания, на третьем месте - Брестский университет.

Весомый вклад в эту победу внес студент I курса ФФК Павел Пелепягин, который стал победителем на дистанции 1000 м. Призерами соревнований также стали студенты факультета физической культуры: Ольга Гончарук - II место, «бронзовые» призеры Наталья Василевская и Наталья Васько. Радость победы команды разделяют и их тренеры В.Романовский и Ф.Мордухай. Подводя итоги кросса, директор спортклуба А.Емельяненко сказал, что все участники кросса выступили ровно, показав высокие результаты, и сумели обойти физкультурную академию.

Количество очков, полученных легкоатлетами в зимних соревнованиях и кроссе, является весомым для общекомандного зачета студенческих спортивных игр. В мае основной экзамен легкоатлетов - летнее первенство вузов Республики Беларусь. Думается, что и здесь наши легкоатлеты будут на высоте.

## НА БОРЦОВСКИХ КОВРИКАХ

Первенство по борьбе самбо в программе республиканских студенческих спортивных игр собрало девятнадцать команд, в том числе и студентов Гродненского университета. Три первых и три третьих места и второе командное место - таков итог выступления спортсменов университета. На высшую ступень пьедестала почета поднялись студенты факультета физической культуры: Олег Яшкин - вес 62 кг, Дмитрий Новик - вес 57 кг и Юрий Ловейкин - вес 82 кг, в финале победивший члена сборной РБ Дмитрия Королькова.

Бронзовыми медалями награждены Александр Гродников (иняз) - вес 57 кг; Иван Ярошевич (ФЭУ) - вес 62 кг; Вадим Уколов (ФФК) - вес 100 кг.

Главный тренер команды, мастер спорта Иван Эдуардович Шарко сказал, что наша команда могла побороться и за первое место с командой Академии физвоспитания, но из-за травм не смогли бороться мастера спорта Александр Шутиков, Дмитрий Андруков. Болезнь помешала соревноваться призеру чемпионата РБ Дмитрию Шарко. Уверенно боролись Яшкин и Новик, которым предстоит выступать в Софии на Европейском первенстве.

В Кубке спортклубов Республики Беларусь по борьбе дзюдо успешно выступили команды девушек (тренер А.Бардин) и юношей (тренер И.Шарко), завоевавшие вторые командные места.

## ПОБЕДА БУДУЩИХ ЮРИСТОВ

Семь сборных женских команд факультетов разыграли первенство вуза по волейболу в программе университетской спартакиады. Без поражений выступили будущие юристы, победив в пяти встречах с одинаковым счетом 2:0, а в одной встрече они уступили одну партию, обыграв будущих филологов - 2:4, стали победителями первенства.

Вот кто привел команду к победе: Ирина Колодинская (капитан команды), Дарья Парамонова, Елена Кедаль, Вероника Кашлей, Ольга Нерушевич, Виктория Чирун, Юлия Зыбель и Оксана Пожарицкая (зам. декана по спорту А. Кудель).

Одинаковое количество очков набрали две команды - факультета психологии и педагогики и филфака. По лучшей разнице партий «серебро» у психологов, «бронза» - у филологов. Далее места распределились так: факультет экономики и управления, математики, истории и культуры и физико-технический факультет.

Следует отметить, что по сравнению с прошлым годом уровень техники игры команд-призеров возрос. Сказалось то, что с начала учебного года работает секция женского волейбола, занятия в которой ведет студент V курса физико-технического факультета В.Паняшин. Еще много предстоит работы волейболистам, чтобы достойно выступать на городских и областных соревнованиях.

## СОСТЯЗАНИЯ ВОЛЕЙБОЛИСТОВ

Продолжаются соревнования среди преподавателей и сотрудников университета в программе спартакиады «Здоровье».

На протяжении недели шли упорные поединки волейболистов. Пять команд оспаривали призы профкома.

К заключительному дню соревнований без поражения подошла дружина факультета физической культуры (декан В. Карчевский) и с одним поражением - команда физико-технического факультета. В этом поединке и определился победитель. В первой партии с минимальным перевесом победила команда ФФК - 26:24, во второй - физико-технического - 25:18, а в третьей - ФФК -15:11 и завоевала I место.

Вот имена победителей: Навойчик А.И. (капитан), Лищук В.С., Гайдашев Г.Е., Чудаков Ю.И., Сак Ю.В., Кошар С.А. и Лис М.А. Физтеховцы были вторыми, на третьем месте - филологи. Далее шли команды юрфака и биофака.

Председатель профкома, доцент Хилюта В.А. поздравил победителей и вручил им подарки.

**Физкультурно-оздоровительный центр Гродненского государственного университета имени Янки Купалы**

ведет прием преподавателей, сотрудников и студентов университета в кабинете массажа, расположенном по адресу: ул. Захарова, 32, каб.32.

Получить необходимую информацию и сделать предварительную запись можно по **телефону 72-22-01 с 12.00 до 14.00.**

*Звоните, приходите!*

## НА ГОЛУБЫХ ДОРОЖКАХ

Бассейн Гродненского Дворца детско-юношеского творчества был местом проведения соревнований по плаванию в программе спартакиады университета.

Восемь сборных команд университета вели спор за победу и за призы в личном первенстве.

У юношей на дистанции 100 метров вольным стилем весь пьедестал почета принадлежал студентам факультета экономики и управления: Сергей Козырев - 0,57,18 сек. - его победный результат; на втором месте Александр Карпицкий - 0,57,7 сек.; третий - Павел Савостьян - 0,58,7 сек.

У девушек, которые соревновались на дистанции 50 м вольным стилем, тройка призеров выглядит так: I место - Марина Беленкова (филфак) - 0,30,7 сек.; второе - Елена Шишкина (ФЭУ) - 0,34 сек.; третье - Наталья Филипчик - 0,35 сек.

В эстафетном плавании 4х50 м у юношей победила команда факультета экономики и управления, у девушек - команда филологического факультета. Кубок за командную победу завоевал факультет экономики и управления (зам.декана по спорту Т.Малышко), на втором месте - будущие юристы. на третьем - математики, далее идут команды филологов, историков, физиков, биологов и психологов. Команда университета принимала участие в первенстве города по плаванию и заняла второе место,пропустив вперед дружину училища олимпийского резерва.

# ✱ АСТРОПРОГНОЗ НА МАЙ ✱

**ОВНЫ.** Все, что Овны делают в охотку, получится у них хорошо. Это касается и учебы. Май подбивает относиться к занятиям как к развлечениям. Успех придет непременно, если Овны не будут воспринимать свое дело как тяжкий нудный труд. Неприятных неожиданностей звезды в мае не готовят.

**ТЕЛЬЦЫ.** Ваше самочувствие будет, судя по всему, переменчивым. Старайтесь свести к нулю риск: избегайте переохлаждения, конфликтных ситуаций, физических и умственных перегрузок. В этом месяце хорошо бы начать закаливание. Занятия спортом принесут хорошие результаты. Будьте осторожны в контактах с незнакомцами. Вы рискуете быть обманутыми.

**БЛИЗНЕЦЫ.** Необходимо поберечь нервы в дни новолуния. Кстати, в эти дни снижается иммунитет. Но, благодаря теплу и энергии Солнца, близнецы во второй половине ощутят прилив сил и бодрости. В целом месяц хорош для отдыха: то, что организм получит в мае, послужит долгосрочным запасом на будущее. Работа, учеба не принесут ни успеха, ни результатов. Неблагоприятен май и в финансовом отношении, а также для контактов.

**РАКИ.** Оцените свой реальный потенциал. Похоже, Вы берете на себя непосильное бремя, так как в мае звезды не благоприятствуют решению сложных задач. Распределите дела равномерно на весь месяц. Лучшей энергетической подпиткой может стать встреча с друзьями, родственниками, которых Вы давно не видели. Стремитесь к таким контактам и будете в выигрыше. Неизбежны материальные затраты, но приобретения того стоят. Они будут служить долго и принесут радость.

**ЛЬВЫ.** Ощутив прилив сил и уверенности в себе, некоторые Львы вознамерятся улучшить для своей семьи жизненные условия. Обновляйте интерьер, делайте ремонт: благодетельный Юпитер задаст высокий уровень желаемого: если мебель - то хорошую, если отдых - то полноценный. Кстати, в мае Львам удастся совместить желаемое и возможное. Это будет заметно и в финансах, и в отношениях с людьми.

**ДЕВЫ.** Нигде не чувствуя себя в полной безопасности, кроме своего дома, Девам откроется еще одна тихая заводь: природа. Полная гармония с ней, душевный покой и равновесие - вот что принесет в мае даже короткое общение Дев с природой, с братьями меньшими. И эта отдушина (если Девы сумеют ее заполучить), не подвластна бурям страстей и перемен. В целом месяц благоприятный.

**ВЕСЫ.** С необыкновенной теплотой и нежностью относятся Весы к земле. Те, у кого есть земельный участок, получат немало приятных мгновений. Кстати, все трудозатраты окупятся непременно. Ни капризы природы, ни другие случайности не должны помешать Весам общаться с природой. В мае велика вероятность встречи со своей Судьбой. На Вашем небосклоне может зажечься яркая звезда любви.

**СКОРПИОНЫ.** Дружба Скорпионов тепла и сердечна. Этим иногда злоупотребляют. Не дайте себя обмануть, будьте настороже. Первая половина месяца - общение с друзьями. Другая половина благоприятна для самореализации в профессиональной сфере, учебе. У многих появятся шансы заметно расширить сферу интересов за счет контактов с содержательными людьми.

**СТРЕЛЬЦЫ.** Май располагает к дружескому общению, которое, кстати, сулит еще и пользу (почерпнете немало нужной информации). Посещение баров, дискотек будет Вам с друзьями в охотку благодаря Венере, любительнице удовольствий и наслаждений. Но не забывайте отдавать долги. Майские долги имеют обыкновение нарастать как, снежный ком. Благоприятные дни - 5, 10, 25.

**КОЗЕРОГИ.** Вас ждут короткие приятные поездки, встречи с желанными людьми. Омрачит настроение нехватка денег. Весь май Вы будете ощущать дефицит финансов, и лишь в конце месяца положение начнет меняться в лучшую сторону. Но что-то накопить или отложить, увы, - не удастся. Деньги придут и уйдут. Зато останутся приятные воспоминания.

**ВОДОЛЕИ.** Юпитер способствует тому, чтобы Вы прилично заработали за счет своих связей. Есть опасность травматизма. Будьте осторожнее на дорогах, на водоемах. В целом месяц хороший, если не считать мелких конфликтов с домашними.

**РЫБЫ.** У некоторых Рыб май - время нереста. Не теряйте голову! Вас подстерегает опасность именно на этой почве. Звезды советуют быть внимательными и разборчивыми в знакомствах с особами противоположного пола. Если Рыбы проявят деловую активность и уверенность в себе, у них появятся новые источники дохода.

*Рэдактар* **Людміла Мікалаеўна ДАНІЛАВА**

*Заснавальнік: Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы.*
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 519.

Газета набрана, звярстана і надрукавана на тэхніцы выдавецкага аддзела Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы. ЛП № 111 ад 29.12.97 г.
Вул. Ажэшкі, 22, 230023, г. Гродна.

*Набор і вёрстка:* **М. ВЕРСТАК, В. ЗАКРЭЎСКІ**
*Фота:* **Ул.САРОКІН**
*Карэктура:* **Н. ДУДКО**

*Здадзена ў набор 22.04.99.*
*Падпісана да друку: 03.05.99. 15.00*
*Заказ № 47*

Аб'ём - 1 ум. друк. арк.
Наклад 500 асобнікаў.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў адказваюць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытатаў, эканамічных даных, асабістых імёнаў, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара.

*Наш адрас:* 230023, г.Гродна, вул. Ажэшкі, 22, пакой 228. ☎ 72-08-17.